УДК 792.036(476):792.096

*У. А. Трапянок*

# Перыяды станаўлення і развіцця беларускага радыётэатра

*Мэтай даследавання з'яўляецца выяўленне асаблівасцей функцыянавання беларускага радыётэатра, вылучэнне перыядаў яго развіцця з указаннем часавых меж, адметных аўдыятвораў і вядомых стваральнікаў радыёдрамы. Аўтар прыходзіць да высновы, што ад першых дзён сваёй дзейнасці да сучаснасці радыётэатр застаецца своеасаблівым індыкатарам стану нацыянальнага развіцця краіны ў цэлым.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Беларускі радыётэатр з'яўляецца найярчэйшай вяхой літаратурна-мастацкага радыёвяшчання краіны. Залаты фонд Беларускага радыё складаюць сотні пастановак, здзейсненых у розныя гады. Над іх стварэннем працавалі дзясяткі творцаў, якія адаптавалі першакрыніцы ці пісалі арыгінальныя п'есы, рэжысіравалі, ігралі, займаліся музычна-гукавым афармленнем і запрашалі слухачоў у загадкавы свет радыётэатра. Задачай даследавання стала вывучэнне этапаў развіцця і станаўлення радыётэатра Беларусі ад першых яго гадоў існавання да нашых дзён. Мастацкую з'яву першых дзесяцігоддзяў у кантэксце агульнага развіцця нацыянальнага радыёвяшчання даследавалі пераважна Я. Радкевіч [6], Б. Пяркоўскі [5] і інш. Асобныя артыкулы пра рэжысёраў і акцёраў напісалі С. Гаціла [2], А. Усцінава [8], Б. Бур'ян [1], В. Навуменка [4], Д. Стэльмах [7] і інш. Мэтамі гэтага даследавання з'яўляюцца выяўленне асаблівасцей функцыянавання беларускага радыётэатра ў гады незалежнай Беларусі, вылучэнне перыядаў яго развіцця з указаннем часавых меж, найбольш вядомых стваральнікаў радыёдрамы і адметных аўдыятвораў.

Радыёвяшчанне ў Беларусі пачалося ў лістападзе 1925 г. Да 1932 г. удасканальваўся тэхнічны бок станцыі, вяліся пошукі форм вяшчання, пракладваліся правадныя сеткі, актыўна фарміравалася мастацкае, у т. л. літаратурна-драматычнае, вяшчанне. У 1926 г. калегія Наркамата асветы БССР прыняла «спецыяльную пастанову, якая абавязвала тэатральныя калектывы выступаць не меней аднаго разу на тыдзень на так званай шырокавяшчальнай станцыі» [6, с. 17]. Менавіта 1926 г. можна лічыць пачаткам гісторыі і зыходнай кропкай першага пачатковага перыяду радыётэатра. У студзені 1928 г. у радыёэфіры адбылася трансляцыя творчага вечара, прысвечанага айчыннаму мастацтву, на якой прагучала аднаактовая п'еса «Чорт і Баба» з А. Ільінскім у галоўнай ролі. Супрацоўнікі радыёстудыі інсцэніравалі празаічныя творы пісьменнікаў Я. Коласа (апавяданні «Соцкі падвёў», «Нёманаў дар», аповесці «На прасторах жыцця», «Адшчапенец» і інш.), З. Бядулі («Пяць лыжак заціркі»,

«Дэлегатка», «Рунь» і інш.), К. Чорнага («Вераснёвыя ночы», «Лявон Бушмар» і інш.), М. Лынькова («Андрэй Лятун», «Над Бугам»).

Утвораны ў пачатку 1930-х гг. Камітэт па радыёфікацыі і радыёвяшчанні пашырыў магчымасці развіцця вяшчання ў Беларусі. Новыя структуры наладжвалі творчыя стасункі з Усесаюзным радыё. На Беларускім радыё з'явіўся сектар літаратурнага вяшчання – найвялікшае структурнае падраздзяленне, якое хутка пачало называцца аддзелам літаратурна-драматычнага вяшчання. Перад сектарам была пастаўлена задача шырокай прапаганды айчыннай і замежнай літаратуры, стварэння арыгінальнай радыёп'есы. У эфір пачалі выходзіць інсцэніраваныя творы А. Пушкіна, М. Салтыкова-Шчадрына, Дж. Рыда, Б. Брэхта, Д. Пасаса і інш. Адным з першых аўтараў, чыё імя ўвайшло ў гісторыю беларускай радыёдрамы, стаў В. П. Палескі, які ў 1934 г. напісаў арыгінальную п'есу для радыё «Радня». Матэрыял прысвячаўся надзённым праблемам калгаснай вёскі, перыпетыям класавай барацьбы, што разгарнулася ў гады калектывізацыі. У рэдакцыі меліся таксама радыёп'есы «На платформе» В. Сташэўскага, «Хвароба Лаўрэна» А. Ільінскага, п'еса «Канец дружбы» К. Крапівы.

Адным з першых рэжысёраў стаў Л. Алендэр, які сцвярджаў, што галоўная задача радыёрэжысуры заключалася ў тым, «каб ярка данесці слова і слоўны вобраз да слухача, каб пераклаcці слоўны і гукавы вобраз у вобраз відавы... Іграць для вуха, каб успрымала і вока» [6, с. 55]. Адной з лепшых работ Л. Алендэра стала радыёдраматычная паэма «Прыгавор следуе». Душэўны стан героя, знешнюю абстаноўку падзей у творы падкрэслівала музыка А. Туранкова.

У другой палавіне 1930-х гг. Беларускае радыё звярнулася да твораў лепшых айчынных літаратараў. У эфіры транслíраваліся інсцэніроўкі твораў Я. Купалы (паводле паэмы «Курган»), Я. Коласа (паводле аповесці «Дрыгва»), К. Чорнага (паводле рамана «Трэцяе пакаленне»), М. Лынькова (радыёп'еса «Атаман» па апавяданні «Баян»), Э. Самуйлёнка (паводле аповесці «Тэорыя Каленбрун»), спектаклі па п'есах «Паўлінка», «Партызаны», «Хто смяецца апошнім» і інш. [6, с. 56]. Адчуваўся недахоп аўтараў, здольных пісаць для радыё. У 1937 г. радыёстанцыі краін, што ўваходзілі ў склад СССР, пачалі вяшчаць па адзінай усесаюзнай сетцы. У нацыянальныя праграмы ўключаліся перадачы з маскоўскай рэдакцыі. У эфіры з'явілася праграма «Тэатр перад мікрафонам». Пачатковы перыяд радыётэатра меў развіццё да канца 1930-х гг., пакуль у творчых колах не запанавала атмасфера страху пасля рэпрэсій. Канчаткова першы этап, адметны пошукамі форм мастацкага радыёвяшчання, спроб і дэбютаў беларускага радыётэатра, калі галоўнымі мастацкімі сродкамі былі фраза і музыка, завяршыўся з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны ў 1941 г.

Мяжой другога пасляваеннага перыяду беларускага радыётэатра варта лічыць 1944 г., калі ў верасні радыёстанцыя імя СНК БССР

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аднавіла працу ў Мінску. Пісьменнікі І. Шамякін, М. Лынькоў, І. Мележ, А. Кулакоўскі, Я. Брыль, І. Грамовіч, У. Карпаў і іншыя ўслаўлялі геразм савецкага народа. Радыё агучвала некаторыя творы гэтых аўтараў, у практыку ўкараніліся чытанні з працягам. Радыётэатр, як і сцэнічнае мастацтва, стаў люстэркам перажытага. У рэпертуары пераважалі пастаноўкі рэалістычнага кірунку.

У пачатку 1950-х гг. адкрыліся новыя тэхнічныя магчымасці, звязаныя з выкарыстаннем запісу і мантажу твораў. Рэжысёры ўводзілі ў радыёспектаклі гукі, музычныя напластаванні на голас выканаўцаў. Наяўнасць дубляў істотна павысіла якасць выніковых аўдыяработ. У пасляваенны перыяд радыё даказала сваю самастойнасць, сцвердзіла, што на першы план выходзіць глыбіннае, падсвядомае, якое ў выніку таксама робіцца «бачным» ва ўяўленні слухача. Былі запісаны спектаклі «Канстанцін Заслонаў» паводле А. Маўзона, «Гэта было ў Мінску» паводле А. Кучара, «Брэсцкая крэпасць» паводле К. Губарэвіча. Б. Пяркоўскі адзначаў, што з прыхільнасцю слухачы прынялі спектаклі «Пакуль мы маладыя» І. Мележа, «Выбачайце, калі ласка» А. Макаёнка, «Пяюць жаваранкі» К. Крапівы. Станоўчыя водгукі атрымалі пастаноўкі паводле твораў І. Шамякіна «У добры час» і П. Пестрака «Сустрэнемся на барыкадах», «Глыбынь-гарадок» паводле Л. Обухавай і інш. [5, с. 30]. Папулярнасцю ў пасляваенны перыяд карысталася рубрыка «Тэатр перад мікрафонам». Адметнай рысай сталі трансляцыі спектакляў самадзейных калектываў.

Вялікі ўклад у папулярызацыю мастацкага вяшчання зрабіў рэжысёр (1947–1963 гг. – галоўны рэжысёр), драматург, аўтар інсцэніровак для радыё П. Данілаў. Найбольш адметнай работай П. Данілава названы радыёспектакль «Прымакі» паводле аднайменнай п’есы Я. Купалы [3].

У 1956 г. пачалося вяшчанне Беларускага тэлебачання. Аўдыявізуальны прадукт, які з кожным годам рабіўся папулярным, ставіў пад сумненне далейшае існаванне радыё, але ж стаў нагодай для рэарганізацыі мастацкага радыёвяшчання і пачаткам трэцяга перыяду радыётэатра Беларусі: перыяду росквіту, «залатога часу». На стыку 1950–1960-х гг. асвойваўся тэлевізійны спосаб паказу ў прамым эфіры, пачаў актыўна развівацца тэлевізійны тэатр [9]. Радыёрэжысёры змянілі тэмпарытм пастановак (яны сталі больш дынамічныя). За аснову бралася найлепшая літаратура, акцэнт у аўдыятворы рабіўся на псіхалогію герояў, іх эмоцыі, перажыванні. Адной з першых работ перыяду росквіту стала радыёнавела «Зорка Венера» паводле Б. Бур’яна, І. Нісневіча, якую ў 1960 г. паставіла М. Троіцкая. Яе творчы шлях у якасці рэжысёра літаратурна-драматычнага вяшчання пачаўся ў 1957 г. У 1964–1974 гг. яна з’яўлялася галоўным рэжысёрам радыё. Пад яе кіраўніцтвам ажыццёўлены дзясяткі запісаў буйных і малых пастановачных форм, часопісаў, літаратурных, музычных кампазіцый. М. Троіцкая паставіла

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

больш за 30 радыёспектакляў [8]. Найбольш удалымі лічацца пастаноўкі твораў «Збянтэжаны Саўка» паводле Л. Родзевіча, «Сустрэнемся на барыкадах» паводле П. Пестрака, «Сэрца на далоні» паводле І. Шамякіна, «Круты бераг ракі» паводле В. Быкава, «Новая зямля» паводле паэмы Я. Коласа і інш.

Значны ўклад у развіццё беларускага радыётэатра зрабіла С. Гурыч. Працуючы ў 1967–1986 гг. галоўным рэжысёрам галоўнай рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання, яна паставіла больш за 200 спектакляў. Яе супрацоўніцтва з беларускімі пісьменнікамі было плённым – пастаўлены эпічныя тэлеспектаклі па творах «Жураўліны крык», «Пайсці і не вярнуцца» В. Быкава, «Хлеб», «Першы генерал» і «Вазьму твой боль» І. Шамякіна, «Векапомныя дні» М. Лынькова, «Мінскі напрамак», «Завеі, снежань» І. Мележа, «Новая зямля» Я. Коласа [2] і інш. У 1984 г. творчы калектыў на чале з С. Гурыч удастоены першай у гісторыі радыёвяшчання краіны Дзяржаўнай прэміі БССР за радыёпастаноўкі па творах «Хамуціус» А. Куляшова і «Рыбакова хата» Я. Коласа. Арыгінальныя радыёспектаклі С. Гурыч сталі новай з’явай у развіцці беларускага радыётэатра.

Адметнай у рабоце на беларускім радыё была дзейнасць Т. Аляксеевай, галоўнага рэжысёра рэдакцыі для дзяцей і юнацтва ў 1971–1976 гг. Сярод яе работ вылучаюцца «Падарожжа блакітнай стралы» паводле Дж. Радары, «Буквар» паводле В. Хомчанкі, «Расці, Ганька!» паводле А. Васілевіч, «Лалі-лаль» С. Клімковіч і інш. [7].

Цікавая асоба на беларускім радыё – І. Лапцінскі, рэжысёр з 1963 г., галоўны рэжысёр у 1975–1980 гг. Сярод лепшых работ у яго творчай біяграфіі сталі спектаклі па творах «Палескія рабінзоны» Я. Маўра, «Спартак» Р. Джаваньёлі, «Лясная крэпасць» М. Гамолкі, «Мой генерал» А. Ліханава, «Лёс паэта» В. Шымука, «Дарога на дваіх», «Вяртанне да сябе», «Не праміні свой лёс» М. Калошкі, «Лівень» А. Жука і інш.

Галоўны рэжысёр Беларускага радыё ў 1982–2000 гг. В. Анісенка запісаў каля 100 радыёспектакляў. Найлепшыя з іх пастаўлены ў 1980-х гг.: «Нельга забыць» і «Чорны замак Альшанскі» паводле У. Караткевіча, «Кар’ер» і «У тумане» паводле В. Быкава, «Родныя дзеці» паводле Н. Гілевіча. За спектакль «У тумане» творчая каманда на чале з В. Анісенкам у 1990 г. атрымала Дзяржаўную прэмію Рэспублікі Беларусь [4].

У перыяд росквіту на Беларускім радыё працавалі рэжысёры І. Андрэева, Э. Зайцава, С. Сцефановіч, Г. Малумава, В. Кернажыцкая, гукарэжысёры В. Красоўскі, Э. Мартэнс, А. Бублікаў, Т. Яўневіч, Р. Донцыс, В. Бяляеў, Л. Латушкіна, Л. Зуб, В. Лешчанок і інш. З беларускім радыётэатрам актыўна супрацоўнічалі кампазітары І. Лучанок, Я. Глебаў, У. Кандрусевіч, У. Кур’ян, А. Залётнеў і інш.

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

Чацвёрты пераходны перыяд беларускага радыётэатра пачаўся ў 1991 г. пасля распаду СССР. Змены адбываліся ва ўсіх сферах жыцця, тычыліся яны і радыёвяшчання, якое станавілася на шлях нацыянальнага развіцця. У працэсе стварэння арыгінальных радыёспектакляў намецілася тэндэнцыя да спаду, спыніўся абменны працэс пастаноўкамі з рэдакцыямі іншых рэспублік былога СССР. У якасці рэжысёра ў гэты перыяд паспрабаваў сябе А. Вінярскі. Для пастановак пач. 1990-х гг. ён выкарыстоўваў творы замежных аўтараў, сярод якіх А. К. Дойл, Р. Говард, С. Моэм, Ф. Дзюрэнмат і інш. Гэта былі невялікія па фармаце спектаклі, сярод якіх вылучаўся аўдыятвор «Маёнтак Блесанвіль» паводле Р. Говарда – містычная пастаноўка з выкарыстаннем тэхнічных асаблівасцей запісу. У 1996 г. А. Вінярскі як рэжысёр рэдакцыі літаратурна-драматычнага вяшчання паставіў спектаклі «Крылаты кінжал» паводле Г. К. Чэстартана і «Жоўты твар» паводле А. К. Дойла. У 1996 г. з'явілася праграма «Акно ў свет». Нестандартныя падыходы яе рэжысёра А. Казлені ажывілі эфір. За пяць гадоў існавання праграмы было запісана больш за сто перадач паводле твораў замежнай літаратуры. У рэжысёрскай камандзе радыё ў той час таксама працавалі І. Лапцінскі, В. Кернажыцкая, З. Паўлоўская, С. Сцефановіч, З. Гуцеева, Р. Патака і інш. Дзіцячая рэдакцыя раз у месяц запісвала па адным спектаклі. Рэжысёр І. Лапцінскі паставіў радыёспектакль «Палескія вандроўнікі» паводле Г. Пашкова, за які ў 1998 г. была ўручана Дзяржаўная прэмія Рэспублікі Беларусь [1]. На радыё з'явіўся першы пастановачны серыял «Карпіцкія» пра жыхароў аднаго блочнага дома ў Мінску. Сюжэт будаваўся на гісторыях мінчан, іх падзеях, цікавых характарах. Праект праіснаваў да 2001 г., пасля яго закрылі. У 1999 г. І. Лапцінскі стварыў спектакль паводле п'есы Л. Шчэрбача «Час дыназаўра». У 2000 г. выйшла пастаноўка гэтага ж рэжысёра «Дзень нараджэння» паводле п'есы «Маці і сын» фінскай пісьменніцы Э. Пенанен. Пераходны перыяд беларускага радыётэатра завяршыўся ў 2001 г.

У 2006 г. да 20-годдзя катастрофы на Чарнобыльскай атамнай электрастанцыі кіраўніцтва Беларускага радыё ініцыіравала пастаноўку спектакля «Ігнатаў рубеж» па п'есе В. Ткачова «Нехта ходзіць пад акном». Рэжысёрская работа А. Вінярскага над гэтым аўдыятворам па сутнасці адкрыла пяты сучасны перыяд беларускага радыётэатра і вызначыла спецыфіку далейшай працы: пастаноўкі пачалі прымяркоўваць да юбілейных дат, рэжысёры (іх штат у пач. 2000-х гг. зведзены да мінімуму) у сваёй дзейнасці прытрымліваліся класічных традыцый папярэдніх пакаленняў радыёрэжысёраў, ролі ў пастаноўках выконвалі запрошаныя артысты мінскіх тэатраў.

У 2007 г. да 125-годдзя з дня нараджэння народнага паэта БССР Я. Купалы рэжысёр Р. Патака паставіла спектакль паводле твора П. Васючэнкі «Паэт і дзяўчына». Гэтая дакументальна-мастацкая гісторыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

кахання адрознівалася арыгінальным сюжэтам, рытмагарманічнай паэзіяй Я. Купалы, музыкай кампазітара Л. Захлеўнага і лірычнымі інтанацыямі выканаўцаў роляў.

У 2009 г. на Беларускім радыё паставілі два спектаклі. Да 65-годдзя вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў рэдактар Г. Шаблінская інсцэніравала аповесць В. Быкава «Пастка». Аднайменны спектакль паставіў рэжысёр А. Вінярскі. Аўдыяработа была высока ацэнена. Радыёслухачы зразумелі горкую праўду, якую спавядаў у сваёй творчасці В. Быкаў. Рэжысёр Л. Пташук у 2009 г. звярнулася да п'есы драматурга А. Дударава «Крыж» і дадала ў фонд беларускага радыётэатра аднайменны твор на духоўную тэматыку. Пастаноўку прысвяцілі 100-годдзю вяртання на радзіму мошчаў прападобнай Ефрасінні Полацкай.

Яшчэ адной работай на духоўную і гістарычную тэму стаў радыёспектакль паводле твора У. Сыракомлі «Магнаты і сірата. Соф'я, князёўна Слуцкая». Дзеянне ў пастаноўцы адбываецца ў Вільні ў 1600 г. Аўдыятвор пастаўлены да 420-годдзя з дня нараджэння славутай князёўны, абаронцы праваслаўя на беларускіх землях.

Практыку адаптацыі для радыёэфіру твораў, запісаных са сцэны, у 2011 г. аднавіла рэжысёр Л. Пташук. Яна перанесла на электронныя носьбіты спектакль Нацыянальнага акадэмічнага тэатра імя Я. Купалы «Тутэйшыя» паводле Я. Купалы. Актуальнасць п'есы, акцёрскія работы, наватарскі рэжысёрскі падыход М. Пінігіна зрабілі спектакль адным з самых папулярных у рэпертуары тэатра. Радыёверсіі, на нашу думку, не хапае выразнасці ў адлюстраванні падзей твора пры ўспрыманні на слых. Радыёспектакль «Тутэйшыя» прысвяцілі 130-годдзю з дня нараджэння народнага паэта Беларусі Я. Купалы і 90-годдзю з часу напісання п'есы.

У снежні 2012 г. да 130-годдзя з дня нараджэння Я. Коласа адбылася прэм'ера спектакля «Адгукніся, браце» паводле п'есы Г. Марчука. Аўдыятвор распавядае пра гады, праведзеныя Я. Коласам у мінскім астрозе, перыяд творчага станаўлення класіка. Пастаноўшчыкам радыёспектакля выступіў прыхільнік рэалістычнага кірунку радыёрэжысуры А. Вінярскі.

70-годдзю вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў прысвечаны спектакль «Млечны шлях» паводле аднайменнага рамана К. Чорнага. Тэмай пастаноўкі з'яўляецца вайна вачыма еўрапейцаў. На чале творчага працэсу стаяў рэжысёр А. Вінярскі. Інсцэніраваў твор для радыё літаратуразнавец П. Васючэнка, які ўвёў новага персанажа ад аўтара – пісьменніка Кузьму Чорнага. Прадстаўнікі літаратурнай і тэатральнай эліты краіны назвалі пастаноўку найлепшай работай радыётэатра за апошні час.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У снежні 2014 г. адбылася прэм’ера монаспектакля «Шляхціц Завальня» паводле Я. Баршчэўскага. Твор прысвяцілі 220-годдзю з дня нараджэння аўтара і 80-годдзю народнага артыста СССР Г. Аўсяннікава, які іграў галоўную ролю ў спектаклі, пастаўленым У. Савіцкім у Нацыянальным акадэмічным тэатры імя Я. Купалы. У аўдыяфармат твор перанесла рэжысёр Л. Пташук.

У маі 2015 г. да 70-годдзя Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне адбылася прэм’ера радыёспектакля «…І няма шляху чужога» паводле аднайменнай аповесці У. Саламахі. Дзеянне ў творы адбываецца ў апошні год Вялікай Айчыннай вайны. Радыёспектакль у пастаноўцы А. Вінярскага насычаны масавымі сцэнамі, што робіць яго адметным сярод пастановак апошніх гадоў.

Такім чынам, за 90 гадоў існавання беларускі радыётэатр прайшоў пяць перыядаў станаўлення і развіцця. Пачатковы перыяд ахапіў 1926–1941 гг. і вызначыўся творчымі пошукамі форм і жанраў. Пасляваенны перыяд 1944–1960 гг. даказаў самастойнасць радыётэатра, адкрыў тэхнічныя магчымасці запісу і мантажу спектакляў. Перыяд росквіту, часавыя межы якога ахопліваюць 1960–1991 гг., характарызуецца паглыбленнем у псіхалогію герояў сцэн пастаўленых радыёспектакляў, дынамікай дзеяння, творчымі эксперыментамі, яскравымі работамі, адзначанымі дзяржаўнымі прэміямі, і вялікай колькасцю прафесіяналаў, занятых у справе радыётэатра. У пераходны перыяд 1991–2001 гг. акрэслілася дынаміка спаду стварэння арыгінальнага аўдыяпрадукту, у гэты час з’явіўся першы мастацкі радыёсерыял «Карпіцкія». Сучасны перыяд, які пачаўся ў 2006 г., вылучаецца нячастымі аўдыятворамі, прымеркаванымі да юбілейных дат і пастаўленых у класічнай манеры. З’яўленне новых рэжысёраў і эксперыментальных работ можа паспрыяць фарміраванню новага кірунку сучаснага перыяду беларускага радыётэатра. Сёння на хвалях Першага нацыянальнага канала і канала «Культура» Беларускага радыё можна пазнаёміцца з мноствам арыгінальных праектаў уласнай вытворчасці. Літаратурна-мастацкае вяшчанне, знаёмячы слухачоў з багатай культурнай спадчынай, далучае аднačасова іх да сучасных тэндэнцый развіцця мастацкага слова, фарміруе мастацкі густ.

1. *Бур’ян, Б. І.* Лапцінскі / Б. І. Бур’ян // Тэатральная Беларусь : у 2 т. – Мінск, 2003. – Т. 2 : Лабанок – Яшчур / рэдкал.: Г.П. Пашкоў [і інш.]. – С. 11.
2. *Гаціла, С. Ф.* Гурыч / С. Ф. Гаціла // Тэатральная Беларусь: у 2 т. – Мінск, 2002. – Т. 1: «А досвіткі…» – Кучынская / рэдкал.: Г. Пашкоў [і інш.]. – С. 324–325.
3. *Герштэйн, Г. Р.* Данілаў / Г. Р. Герштэйн // Тэатральная Беларусь : у 2 т. – Мінск, 2002. – Т. 1 : «А досвіткі…» – Кучынская / рэдкал.: Г. Пашкоў [і інш.]. – С. 333–334.
4. *Навуменка, В. Т.* Анісенка / В.Т. Навуменка // Тэатральная Беларусь: у 2 т. – Мінск, 2002. – Т. 1 : «А досвіткі…» – Кучынская / рэдкал.: Г. Пашкоў [і інш.]. – С. 41–42.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Пяркоўскі, Б. Б.* Радыёвяшчанне і тэлебачанне ў Беларускай ССР / Б. Б. Пяркоўскі. – Мінск : Дзярж. выд-ва БССР, 1957. – 53 с.
6. *Радкевіч, Я. Р.* Беларускае радыё : гісторыя, перспектывы развіцця / Я. Р. Радкевіч. – Мінск : БДУ імя У.І. Леніна, 1983. – 197 с.
7. *Стэльмах, Д. У.* Аляксеева / Д. У. Стэльмах // Тэатральная Беларусь : у 2 т. – Мінск, 2002. – Т. 1 : «А досвіткі…» – Кучынская / рэдкал.: Г. Пашкоў [і інш.]. – С. 34.
8. *Усцінава, А. В.* Троіцкая / А. В. Усцінава // Тэатральная Беларусь : у 2 т. – Мінск, 2003. – Т. 2 : Лабанок – Яшчур / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – С. 416.
9. *Фральцова, Н. Ц.* Тэлевізійны тэатр / Н. Ц. Фральцова // Тэатральная Беларусь : у 2 т. – Мінск, 2003. – Т. 2 : Лабанок – Яшчур / рэдкал.: Г. П. Пашкоў [і інш.]. – С. 454–457.

*U. Trapyanok*

**Periods of formation and development of the Belarusian radio theatre**

*The aim of the study is to identify the peculiarities of the Belarusian radio theatre functioning, the allocation of the periods of its development with indication of the time boundaries, distinctive audioworks and well-known radiodrama creators.*

*The author comes to the conclusion that from the first days of its activity up to the present days the radio theatre remains a unique indicator of the state of national development of the country in general.*

Дата паступлення артыкула ў рэдакцыю: 04.04.2016.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ